# Літаратурны брэйн-рынг
# “Песняры зямлі беларускай”
# (да 140-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа)

**Л. М. Балуева,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
сярэдняй школы № 8 г. Магілёва

Абсталяванне.

1. Ілюстрацыя да п’есы Янкі Купалы “Паўлінка”.
2. Рубель.
3. Дзве карткі з напісанымі на іх вялікімі літарамі: КНУАПГАРЛУАК.
4. Торбачка.
5. Акрайчык хлеба, кавалак сала, апалонік.
6. Чорная скрыня, гонг, секундамер.
7. Тры сігнальныя званочкі ( адзін – вядучаму, два – для гульцоў).

Літаратурны брэйн-рынг праводзіцца з вучнямі старшых класаў. У гульні прымаюць удзел дзве каманды па 6 чалавек. Вядучы прадстаўляе членаў каманды, якія займаюць свае месцы за рознымі сталамі. Пажадана, каб кожны меў паперу і ручку. Адказваць першай мае права тая каманда, якая хутчэй званочкам падасць сігнал. За кожны правільны адказ налічваецца адзін бал. На абдумванне адказаў даецца адна хвіліна. Бліц-пытанне – гэта тры пытанні, кожнае з якіх абмяркоўваецца 20 секунд (1 бал за кожны правільны адказ або 1 бал за тры правільныя адказы).

У выпадку няправільнага адказу першай каманды другая каманда (калі яшчэ не прайшла хвіліна) мае права даць свой адказ.

**Пытанні**

1. У якім творы героі вельмі часта ўжываюць такія словы: “тудэма-сюдэма” і “вось-цо-да”? Хто яго аўтар? (“ Паўлінка”. Янка Купала. )

2. Паслухайце ўрывак з песні (гучыць запіс песні ў выкананні У. Мулявіна). Назавіце назву песні, аўтара слоў, імя і прозвішча спевака. (“ Спадчына” , Янка Купала, Уладзімір Мулявін.)

3. Бліц. Дапоўніце цытаты класікаў:

* Не шукай ты шчасця, долі

На чужым шырокім… (полі);

*Лепш быць няшчасным, але відушчым,

Чымся шчаслівым ды… (сляпым);

* Мой родны кут, як ты мне мілы!..

Забыць цябе не маю… (сілы!)

4. Прыгадайце прозвішча маладога паэта-народавольца і яго верш, што далі псеўданім Канстанціну Міхайлавічу Міцкевічу (Пётр Якубовіч “Колас”.)

5. Картка з літарамі. Знайдзіце спосаб прачытаь два зашыфраваныя словы – псеўданім паэта і назву яго твора. (Купала. “Курган”.)

(Заўвага: псеўданім чытаецца з першай літары праз адну, злева направа, назва адпаведна – справа налева.)

6. Назавіце раздзел паэмы і яе аўтара, дзе галоўны герой варыць клёцкі на бярозавым соку. (“Дзядзька-кухар”. Якуб Колас.)

7. Чорная скрыня. У ёй знаходзіцца пяць рэчаў (прадметаў): акрайчык хлеба,торбачка, кавалак сала, рубель, апалонік.

* Герой з апавядання Якуба Коласа доўга рыхтаваўся да ўцёкаў з братавай хаты, таму збіраў прыпасы і хаваў іх у самы глухі куток пад ложкам. Тое, што ўзяў з сабою хлопчык-сірата ў дарогу, ляжыць у чорнай скрыні. (Акрайчык хлеба.)

* Гераіня вядомай п’есы Купалы рыхтуецца пайсці ў свет, таму і шые сваім дзецям гэтыя прадметы. Які прадмет знаходзіцца ў скрыні? (Торбачка.)

* Героі адной з паэм Коласа былі родныя браты і вельмі сябравалі, заўсёды дзяліліся апошнім, тым, што ляжыць у чорнай скрыні. Што ж гэта?

(Кавалак сала.)

8. Які час Купала лічыў часам “другога свайго нараджэння”? (15 (28) мая 1905 года, калі з’явіўся ўдруку яго першы верш – “Мужык”.)

9. Бліц. Назавіце сапраўдныя імёны і прозвішчы:

* Янкі Купалы (Іван Дамінікавіч Луцэвіч);

* Якуба Коласа (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч).

10. Назавіце першую выканаўцу ролі Паўлінкі ў аднайменным спектаклі народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. (Паўліна Мядзёлка.)

11. Ілюстрацыя. Паглядзіце ўважліва на ілюстрацыю да п’есы Янкі Купалы. Назавіце імёны галоўных герояў твора. (Паўлінка, Якім.)

12. Бліц. Янка Купала і Якуб Колас у жывапісе:

* Як называецца карціна Зянона Паўлоўскага, напісаная у 1945 годзе. (“Янка Купала і Якуб Колас гуляюць у шахматы”.)



* Хто аўтар помніка, які пастаўлены Янку Купалу ў гарадскім скверы ў Мінску? (З. Азгур.)

* Аўтар карціны “Партрэт Якуба Коласа” (У. Стальмашонак.)

13. Якому тэатру Беларусі прысвоена імя Янкі Купалы? (Першаму беларускаму драматычнаму тэатру ў Мінску.)

14. Які тэатр носіць імя Якуба Коласа? (Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа ў Віцебску.)

15. У зборніку “ Казкі жыцця” Якуба Коласа ёсць казка “Ноч, калі папараць цвіце”. Каму прысвечаны гэты твор? (Янку Купалу.)

16. Дужы ты сваім багаццем,

А я сілы брольшай,

За мной праўда і народ мой,

За табой жа – грошы.

Каму належаць гэтыя словы? (Бандароўне.)

17. Назавіце месца і час, адлюстраваныя на карціне, калі сустрэліся паэты ўпершыню. (На хутары Смольня ў 1912 годзе.)



18. Запішыце наступныя назоўнікі:

1. Аксюмаран. 2. Інверсія. 3. Чытальнік. 4. Цырымонія.

Знайдзіце спосаб прачытаць з іх назву малой радзімы Якуба Коласа. (Ак-ін-чы-цы – Акінчыцы.)

19. Бліц. Назавіце аўтараў і творы, героямі якіх з’яўляюцца:

а) Міхалка (Якуб Колас “Дзеравеншчына”);

б) Лявон Зяблік ( Янка Купала “Раскіданае гняздо”);

в) Базыль ( Якуб Колас “У старых дубах”).

20. Чорная скрыня. Першы свой верш “Вясна” Колас прачытаў бацьку. Якую ўзнагароду атрымаў будучы паэт? Гэта быў яго першы ганарар. Падобны да яго і знаходзіцца ў чорнай скрыні. (Рубель.)

21. Вызначце жанр твора Якуба Коласа “Конь і сабака”. (Байка.)

22. Бліц. Адгадайце беларускія загадкі.

* Сівы бык у акенца шмыг. (Світанак, раніца.)

* Хоць і красен, ды не дзеўка, хоць з хвастом, ды не мыш. (Бурак.)

* Які звер пакідае птушыныя сляды? (Выдра.)

23. Вызначце жанр твора Янка Купалы “Пчолы і трутні”. (Байка.)

24. Чорная скрыня. Паслухайце ўрывак з паэмы Якуба Коласа “Новая зямля”:

Услон заняў сваё ўжо места,
На ім  стаяла дзежка цеста,
І … то і дзела
Па дзежцы боўтаў жвава, смела
І кідаў цеста ў скавародкі.

У скрыні знаходзіцца тое,  чым налівалі цеста. (Апалонік.)